# ШЧАСЛІВАЙ ДАРОГІ, СЯБРЫ!



Чаму так весела ўсміхаюцца гэтыя юнакі і дзяўчаты? Можа таму, што сёння цудоўны летні дзень і на сэрцы гэтак жа радасна и сонечна, можа таму што апошні дзяржаўны экзамен здадзены... Заваяваны дыпломы—пуцёўкі ў вялікае самастойнае жыццё!

Эдуард Ліпецкі атрымаў накіраванне ў родны Крупскі раён, Таісія Міснік будзе настаўнічаць на Пружаншчыне, Яўген Кухарэнка ў Чэрвені, Мая Ламака — у Высокім, Анатоль Ланько будзе працаваць інструктарам у Мінскім гаркоме камсамола, Анатоля Мацко чакаюць школьнікі на Гродзеншчыне.

**На здымку:** (злева направа) Э. Ліпецкі, Т. Міснік, Я. Кухарэнка, М. Ламака, А. Ланько і А. Мацко.

**Л. Кузьміцкі.**

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 21 (452)

Панядзелак 3 ліпеня 1961 г.

Цана 1 кап.

# НОВЫ АТРАД СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Днямі на аддзяленні журналістыкі завочнага факультэта адбыўся чарговы выпуск маладых спецыялістаў. Яны здалі свой апошні дзяржаўны экзамен і заваявалі права на атрыманне дыплома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Сярод выпускнікоў — нямала людзей, якія не адзін год працавалі ў рэдакцыях і іншых установах. Так, на «выдатна» сесію здалі А. Манькоў, работнік Крычаўскай раённай газеты, Я. Левашоў, карэспандэнт газеты «Советская торговля» па Беларусі. Паспяхова закончылі універсітэт журналісты А. Гапееў, Е. Карклін, М. Кулакова, А. Чыгір, афіцэр запаса В. Столін, літовец А. Велер, украінец Л. Гайтота, рабочы Жодзінскага аўтамабільнага завода былы марак В. Чачко і многія іншыя.

30 чэрвеня адбылося ўручэнне дыпломаў выпускнікам.

**М. ЯГОРАЎ.**

# Завочнаму навучанню—больш увагі

**В. Г. ІВАШЫН,**
дэкан завочнага факультэта.
**В. І. СТАРАВОЙТАЎ,**
нам. дэкана.

Сістэма завочнага навучання ў нашай краіне атрымлівае ўсё большае значэнне. Неабходнасць завочнага навучання абумоўліваецца поспехамі савецкага народа ў галіне эканомікі і культуры, а таксама хуткім павелічэннем колькасці моладзі, якая працуе пасля заканчэння сярэдніх школ на прадпрыемствах, у калгасах, установах і якая жадае атрымаць вышэйшую адукацыю без адрыву ад вытворчасці.

Студэнт-завочнік на працягу шасці гадоў вучобы ва універсітэце абавязан (і гэта добра разумее выключная большасць завочнікаў) атрымаць трывалыя і глыбокія веды па выбранай спецыяльнасці з тым, каб стаць яшчэ больш кваліфікаваным работнікам у той ці іншай галіне народнай гаспадаркі. Дыплом аб заканчэнні універсітэта з'яўляецца пасведчаннем такіх ведаў у чалавека, які носіць на грудзях універсітэцкі значок.

Між тым, няма чаго граха таіць, у нас сярод завочнікаў ёсць даволі значная частка студэнтаў, якія на працягу шасці гадоў навучання ва універсітэце ставяць перад сабою адну адзіную задачу—атрымаць дыплом. Таму такія студэнты з году ў год, ад сесіі да сесіі памалу, не перагружаючы сябе, як-небудзь на «троечку» вучацца, перабіраюцца з курса на курс.

Такія студэнты, як напрыклад, Т. Логінава, В. Наумоўскі, В. Кузняцоў, Н. Касіловіч (юрыдычнае аддзяленне), Дзенгулеўскі (геафак), Хайкіна (аддзяленне біялогіі), Емельянчык (аддзяленне рускай мовы і літаратуры), Катkоўская (аддзяленне матэматыкі) лабараторна-экзаменацыйныя сесіі заканчваюць заўсёды з «хвастамі», а кантрольныя і курсавыя работы здаюць са спазненнем і, як правіла, пасля двух—трох заходаў, бо сур'ёзна працаваць над пісьмовымі работамі не жадаюць.

Каб такія выпадкі не мелі месца, неабходна усім, і не толькі дэканату і выкладчыкам завочнага факультэта, але і самім студэнтам змагацца за высокую дысцыпліну, за добрую якасць вучэбнай работы.

Чоткасць і высокая дысцыпліна ў сістэме завочнага навучання — крыніца трывалых ведаў і рашаючая ўмова паспяховага заканчэння універсітэта. Гэтай самай простай ісціны, якую не раз і не два растлумачвалі ў дэканаце недысцыплінаваным студэнтам, не хочуць разумець тыя, хто лічыць за правіла спазняцца на сесіі, несвоечасова прадстаўляць курсавыя і кантрольныя работы.

У бягучым навучальным годзе група студэнтаў 3-га курса юрыдычнага аддзялення сарвала экзамен па нямецкай мове на той аснове, што іх, моў, не спыталі, ці падрыхтаваны яны здаваць Прыкладу старэйшых паследвалі студэнты 1-га курса таго ж аддзялення: Вяршыла, Ганчукаў, Афанасьеў, Зеляневўская, Анісімаў не з'явіліся на здачу экзамена па рымскаму праву.

Крайняй недысцыплінаванасцю вызначаюцца студэнты-завочнікі Мінска Анохін, Афанасьеў (аддзяленне журналістыкі). Яны, як правіла, у сесію водпуска не бяруць, на лекцыі з'яўляюцца тады, калі ім уздумаецца. Такога роду «сумяшчальнасць» прыносіць шкоду самім студэнтам, бо ні працай, ні вучобай яны па-сапраўднаму не могуць заняцца.

Вялікае значэнне ў падрыхтоўцы студэнта-завочніка маюць пісьмовыя курсавыя і кантрольныя работы, якія пры ўсіх умовах павінны выконвацца самастойна. Толькі тады пісьмовая работа адпавядае свайму прызначэнню, па ёй выкладчык можа чаму-небудзь навучыць студэнта.

Шкада, што значная частка пісьмовых работ выконваецца фармальна, без сур'ёзнай распрацоўкі тэмы.

Студэнт юрыдычнага аддзялення Рымша дадумаўся тройчы адну і тую работу спісваць з розных першакрыніц, дайшоў да самых агідных формаў маны рэцэнзенту. Студэнт таго ж аддзялення Цэлабенок проста, без маскіроўкі, прадставіў рукапісны экземпляр друкаванай брашуры.

Распаўсюджанай з'явай сярод завочнікаў лічыцца несвоечасовае выкананне рознага роду заданняў. Апраўданняў для такой недысцыплінаванасці маецца колькі хочаце, не ўлічваецца толькі адно, што любое з іх шкодзіць справе, таму што паказвае разбэшчанасць і нежаданне атрымаць ва універсітэце трывалыя веды, так неабходныя на практычнай рабоце.

Летняя лабараторна-экзаменацыйная сесія завочнікаў універсітэта пачалася. Заканчваюць яе біёлагі, географы, а з 1 ліпеня пачнуць здаваць усе астатнія аддзяленні. Работы шмат, бо патрабаванні да студэнтаў-завочнікаў растуць штогод. У гэтым годзе будзе звернута яшчэ больш увагі творчаму авалоданню марксізмам-ленінізмам, спецыяльнымі навукамі і замежнымі мовамі. З гэтай задачай мы можам справіцца паспяхова толькі тады, калі праявім у працэсе заняткаў максімум арганізаванасці і высокай дысцыплінаванасці.

# КАЛІ ПРАЦУЕШ І ВУЧЫШСЯ...

*РЭПАРТАЖ*



Куды б сёння ні глянуў: у аўдыторыі, бібліятэкі, інтэрнаты—усюды ўбачыш студэнтаў-завочнікаў. Яны сядзяць за кнігамі, слухаюць лекцыі, ходзяць на кансультацыі, здаюць залікі і экзамены.

Нялёгка прыходзіцца ў гэтыя дні людзям, якія сумяшчаюць работу з вучобай. Часам давodзіцца не дасыпаць начэй, аддаваць увесь час вучобе, але многія завочнікі даказалі, што яны паспяхова авалодваюць ведамі і практычнымі навыкамі ў галіне выбранай імі спецыяльнасці.

Мы пабывалі ў завочнікаў—першакурснікаў і выпускнікоў. Вось (**здымак 1**) студэнты I курса біяфака займаюцца ў лабараторыі аналітычнай хіміі. У праграму завочнага навучання ўваходзяць практычныя заняткі, работа з прыборамі, хімікатамі, пагэтаму першакурснікі шмат увагі ўдзяляюць іменна заняткам у добра абсталяваных лабараторыях. Яны рашаюць задачы на адкрыццё катыёнаў 5-й групы. Работа складаная, тонкая, але тут жа выкладчык хіміі М. П. Седнеў. Ён дапамагае многім студэнтам.

А на чацвёртым курсе матэматычнага факультэта — апошні экзамен па гісторыі КПСС. Здаўшы гэты экзамен, старшакурснікі могуць сказаць: універсітэт закончан.

Адказвае М. І. Каралькоў. Як бачыце (**здымак 2**), камісія тут строгая і аўтарытэтная: старшыня — акадэмік У. І. Крылоў, члены: прафесар Д. А. Супруненка, дацэнты С. Н. Сцёпін, Л. Н. Тутаеў. Настаўніку Ялуцэвіцкай сямігадовай школы з Брэсцкай вобласці Мікалаю Каралькову крыху боязна, бо ён сам аказаўся ў ролі экзаменуемага.

Але выпрабаванне завочнік вытрымаў з гонарам: камісія ацаніла адказ М. І. Каралькова на «добра». Яшчэ адзін добры матэматык ідзе ў школу!

**А. ВАСІЛЬЕЎ.**
**Фота Л. КУЗЬМІЦКАГА.**



# КВІТНЕЙ, СВЯТА МАЛАДОСЦІ!

*У мінулую нядзелю ля галоўнага корпуса сабраліся святочна апранутыя юнакі і дзяўчаты, студэнты розных факультэтаў БДУ.*

*І вось настала хвіліна, калі юнакі і дзяўчаты пастроіліся ў калоны і рушылі на праспект імя Сталіна, туды, дзе збіралася моладзь з усіх раёнаў Мінска, з заводаў, ВНУ, прадпрыемстваў.*

*Універсітэцкая калона ўпрыгожана кветкамі, зеленню, шарамі. У руках дэманстрантаў транспаранты і лозунгі, партрэты кіраўнікоў партыі і ўрада. Уперадзе—лепшая студэнтка універсітэта Святлана Рудзяк. Яна вучыцца на пятым курсе матэматычнага факультэта. У яе руках палымнее сцяг гаркома камсамола.*

*— Нашы калоны ўзначальваюць святочнае шэсце Ленінскага раёна і горада, — гаворыць хтосьці з членаў камітэта камсамола дэманстрантам.*

*Калоны моладзі накіроўваюцца на плошчу Перамогі, ускладваюць вянкі ля падножжа абяліску загінуўшым воінам.*

*А вось і плошча імя Леніна. Пачынаецца мітынг. З палымяным словам, з віншаваннем да моладзі звярнуўся першы сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Максімаў. Ад імя студэнтаў універсітэта выступіла студэнтка філфака Лілія Сілкіна.*

*Скончан урачысты мітынг. Але свята маладосці працягвалася дапазна. Усюды на вуліцах Мінска гучэла музыка, песні, не змаўкалі смех, вяселле, танцы.*

*Свята маладосці вылілася ў яркую дэманстрацыю яднання савецкай моладзі з усім савецкім народам, з камсамолам і партыяй.*

**Л. СУШКЕВІЧ,**
член бюро камітэта камсамола.

*Васіль МАКАРЭВІЧ*

## У МЯНЕ СТРАЛЯЛІ...

Клён на ўзмежку горбіўся, як
дзед.
Над вёскай дыму плавалі
абрыўкі.
У сорак першым
у такі вось дзень
мяне стаўлялі над крутым
абрывам.
Бы ў ціры, афіцэр ўзнімаў наган,
паліў па хлапчуку
і па ажынніку.
І я, каб утрымацца на нагах,
за тонкую хапаўся быльняжынку.
А каты побач рагаталі:
— Ганс,
не трапіш?!.
Бач, жывучая Расія...
І зноў ад стрэлаў грукатала гаць,
і падалі на дол з травы расінкі.
Гарэлкі штоф ён браў з падноса,
піў,
і да прыцэла прыпадаў паволі.
І вось сарваўся,
прад вачмі паплыў
кавалак сонца,
пух сівой таполі.
Каля шчакі бэз блізка палымнеў,
то станавіўся раптам сінім-сінім.
Я ведаў, што страляючы ў мяне,
яны стралялі ў яе,
Расію.
На ногі я падняўся і упаў.
І зноў устаў.
Паліла сонца з высяў.
А потым цішыня і шолах траў.
І крыкі птушак:
«выжыў», «выжыў», «выжыў».
Я выжыў.
Тыя адышлі гады.
Палеглі каты ў магілу ценямі.
Ды банда новая,
як і тады,
з нагана мне ў сэрца проста
цэліцца.
Грымяць па бруку танкі,—
чуцен стогн
зямлі.
Ісці ў паход ізноў рашылі.
Забойцы, добра ведаю за што
вам ненавісны я
і ўся Расія.
Ды праўды нашай
вам не задушыць,
яе ніхто ніколі не павешае!
Я, чуйце, каты, доўга буду
жыць,
у мяне стралялі
ў дымным сорак першым.

≈⊙≈

## Кузня здароўя

*Летні спартыўны лагер універсітэта можна назваць сапраўднай кузняй здароўя. Тут бываюць дзесяткі студэнтаў, спартсменаў БДУ. У гэтым годзе аздараўленчы лагер арганізаваны ў маляўнічым кутку на возеры Нарач. Першая змена — з 9 ліпеня па 1 жніўня, другая — з 1 па 23 жніўня. Усяго адпачне каля 250 чалавек.*

*Строгі рэжым дня, добрае харчаванне, трэніроўкі спартсменаў па розных відах спорту— усё гэта прадугледжана ў праграме для адпачываючых. З студэнтамі будуць праводзіць заняткі вопытныя трэнеры, выкладчыкі кафедры фізічнага выхавання А. І. Ефімаў, Е. Г. Маркаў, В. В. Рудольф, В. М. Собалева.*

*Сонца, паветра, вада — вось што чакае кожнага, хто захоча пабываць у лагеры.*

В. ШЭПЕЛЕВІЧ.

## У ПРЫЁМНАЙ КАМІСІІ



Дзесяткі заяў паступаюць зараз у прыёмную камісію універсітэта. Здаюць дакументы ўчарашнія рабочыя, калгаснікі, воіны Савецкай Арміі.

НА ЗДЫМКУ: у прыёмнай камісіі.

# З гонарам выканаем задачы ў галіне развіцця навукі і падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў

**23 чэрвеня адбыўся агульнауніверсітэцкі справаздачны партыйны сход. Даклад аб рабоце партыйнага камітэта зрабіў яго сакратар Р. В. Булацкі. Дакладчык падрабязна спыніўся на становучых баках і недахопах у дзейнасці парткома. Ніжэй мы друкуем справаздачу з партыйнага сходу.**

— Справаздачны партыйны сход,—сказаў Р. В. Булацкі, — праходзіць у абставінах велізарнай палітычнай і працоўнай актыўнасці, з якой працоўныя нашай краіны і рэспублікі сустракаюць XXII з'езд роднай Камуністычнай партыі. У бягучым годзе будзе адзначацца і другая знамянальная падзея ў жыцці нашага калектыву — 40-годдзе Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Партыйная арганізацыя універсітэта ў справаздачны перыяд шмат працавала над паляпшэннем навуковай, вучэбнай і выхаваўчай работы, удзяляла вялікую ўвагу падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі рэспублікі. У велізарных дасягненнях савецкай навукі дастойны ўклад уносіць і наша навучальная ўстанова. Поспехі радуюць нас, клічуць на працу, на вырашэнне вялікіх і складаных задач, якія стаяць перад Радзімай, на новых перамогі ў гонар XXII з'езда партыі.

Ажыццяўляючы гістарычныя рашэнні XXI з'езда КПСС, Закон аб сувязі школы з жыццём і далейшым развіцці народнай адукацыі ў краіне, партыйны камітэт і первічныя партыйныя арганізацыі імкнуліся паднясць на больш высокую ступень вучэбна-выхаваўчую работу. З дня прыняцця закона аб перабудове вышэйшай школы прайшло каля двух гадоў. Ва універсітэце пачата падрыхтоўка кадраў па новых спецыяльнасцях: радыёфізікі, радыёэлектронікі і вылічальнай матэматыкі. У 1960/1961 навучальным годзе ва універсітэце адкрыта 8 новых кафедр. Праведзена значная работа па далейшаму ўдасканаленню вучэбных планаў і праграм, паляпшэнню самастойнай работы студэнтаў. Студэнты трэціх курсаў займаюцца па новых вучэбных планах, уведзены новыя спецкурсы і спецсемінары па асобным галінам народнай гаспадаркі і тэхнікі, якія даюць магчымасць падрыхтаваць выпускніцу універсітэта да працы непасрэдна на вытворчасці. Сярод новых спецыяльных курсаў— курсы радыёфізікі і электронікі, паўправаднікоў і іх прымянення ў тэхніцы, ядзернай фізікі, практыкі на вылічальных машынах, біяфізікі і інш.

Набліжана да жыцця тэматыка дыпломных работ, якая адпавядае запытанням тэхнікі, патрэбам народнай гаспадаркі рэспублікі. Студэнты-дыпламанты больш работ пішуць па школьнай тэматыцы. Намеціўся таксама новы напрамак у тэматыцы і метадах выканання дыпломных работ на аддзяленні журналістыкі. Значна палепшылася работа па арганізацыі вытворчай практыкі студэнтаў. Цяпер студэнты праходзяць практыку на такіх прадпрыемствах, як трактарны і аўтамабільны заводы, завод медыцынскіх прэпаратаў, Салігорскі калійны камбінат, Полацкі завод шкловалакна і інш.

Партыйны камітэт і пярвічныя партыйныя арганізацыі больш, чым у мінулым годзе ўдзялялі ўвагі пастаноўцы навучання студэнтаў. На паседжаннях парткома, партыйных сходах, нарадах актыву былі абмеркаваны найбольш актуальныя пытанні перабудовы навучання, паспяховасці, дысцыпліны, работа кафедр і дэканатаў па наладжванню вучэбнага працэса. Гэта дало становучыя вынікі. Заняткі на ўсіх курсах і факультэтах праводзіліся арганізавана, ў адпаведнасці з вучэбным планам, на высокім тэарэтычным узроўні. Вучэбны план па ўсіх дысцыплінах і курсах выканан, паспяховасць студэнтаў нядрэнная. Наперадзе студэнцкага калектыву крочаць студэнты-камуністы. З 155 студэнтаў-камуністаў 94 здалі сесію на добра і выдатна. Гэта студэнты В. Кавалькоў, Е. Пракоп'еў, (аддз. журналістыкі), І. Скурко, А. Макарэнка (бел. аддзяленне), М. Ключнікава, П. Шпак (гістфак), Н. Варын (матфак) і інш. Аднак ёсць сярод студэнтаў непаспяваючыя, што гаворыць аб нашых промахах у рабоце. Асабліва гэта датычыцца студэнтаў фізічнага і матэматычнага факультэтаў. Як правіла, дзе добрая дысцыпліна, дзе наладжана самастойная работа студэнтаў, там і лепшыя вынікі ў вучобе.

Недастатковая ўвага ўдзяляецца ва ўніверсітэце вучобе завочнікаў, хаця сам працэс на завочным факультэце складаней, чым на стацыянары. Не ўсё ў парадку з падрыхтоўкай спецыялістаў на вячэрнім факультэце. Партыйнае бюро і дэканаты мала займаюцца гэтым пытаннем. Аб гэтым сведчаць вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі: з 645 студэнтаў 210 атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Патрэбна пакончыць з недаацэнкай навучання студэнтаў на вячэрнім факультэце.

Значна палепшылася за справаздачны перыяд навукова-даследчая работа. Ва ўніверсітэце вядуцца даследаванні па вельмі важных праблемах, як люмінісценцыя ўранілавых аб'яднанняў і крысталафосфараў, тэорыя гетэрагенных хімічных рэакцый.

Узмацніўся кантроль з боку кафедр, дэканатаў, рэктарата за выкананнем планаў навуковых даследаванняў. Агульны аб'ём навуковых работ, надрукаваных работнікамі ўніверсітэта, складае 510 друкаваных аркушаў. У мінулым годзе ў нашым універсітэце адбыліся дзве міжвузаўскія ўсесаюзныя канферэнцыі.

На рэспубліканскі агляд навуковых студэнцкіх работ прадстаўлена 114 работ, многія з іх атрымалі становучую адзнаку.

Але ўсё ж у пастаноўцы і арганізацыі навукова-даследчай работы ва ўніверсітэце ёсць яшчэ значныя недахопы. Рэктарат і партком не дабіліся поўнага выканання плана навуковых работ, на некаторых кафедрах адсутнічае шырокая навуковая крытыка і самакрытыка, многія выкладчыкі перагружаны вучэбнай работай, што адмоўна адбіваецца на тэрміне і якасці напісання навуковых работ. З гэтым нельга мірыцца і ў далейшым трэба шукаць шляхоў выпраўлення недахопаў.

Кіруючыся рашэннямі партыі і ўрада, партыйная арганізацыя і рэктарат асаблівую ўвагу ўдзялялі ўзмацненню палітыка-выхаваўчай работы. Значна палепшылася работа па прышчапленню любві да будучай прафесіі ў студэнтаў. Праводзіліся сустрэчы са старэйшымі практычнымі работнікамі розных прафесій, вечары сустрэчы з выпускнікамі універсітэта. Узрасла цікавасць студэнтаў да музыкі і мастацтва. Усё гэта дало нядрэнныя вынікі. Ва ўніверсітэце скарацілася колькасць амаральных учынкаў, палепшылася вучэбная дысцыпліна.

Аднак, нягледзячы на гэтыя поспехі, выхаваўчая работа мае сур'ёзныя недахопы. Яе размах яшчэ не поўнасцю адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляе сучаснасць. Ёсць яшчэ накаторая частка студэнтаў, якія дрэнна адносяцца да вучобы, парушаюць дысцыпліну. У гэтым напрамку партыйнаму камітэту і рэктарату патрэбна весці штодзённую вялікую работу.

Партыйная арганізацыя павінна мабілізаваць усе свае сілы і сілы ўсяго калектыву ўніверсітэта на выкананне задач, пастаўленых партыяй і ўрадам, на падрыхтоўку высокакваліфікаваных, высокакультурных узброеных марксісцка-ленінскай тэорыяй спецыялістаў для народнай гаспадаркі.

Партыйная арганізацыя ўніверсітэта моцная і працаздольная. Дакладчык запэўнівае прысутных, што партыйная арганізацыя, увесь калектыў БДУ з гонарам выканаюць задачы ў галіне развіцця навукі і падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў і сустрэне XXII з'езд партыі новымі дасягненнямі.

* * *

САКРАТАР камітэта камсамола **Р. М. Малюковіч**, які першым выступіў у спрэчках па справаздачы парткома, расказаў аб барацьбе камсамольскіх арганізацый факультэтаў і курсаў за высокія веды і ўзорную дысцыпліну студэнтаў, за далейшае ўмацаванне сувязі камсамольскага калектыву ўніверсітэта з моладдзю прамысловых прадпрыемстваў і будоўляў. На 5 буйных прадпрыемствах Мінска па ініцыятыве камсамольскай арганізацыі створаны курсы па падрыхтоўцы рабочай моладзі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, на якіх вучацца 450 маладых рабочых. На многіх прадпрыемствах працуюць кансультацыйныя пункты. У сакавіку бягучага года праведзен вечар сустрэчы перадавых рабочых Мінска са студэнтамі ўніверсітэта. Узмацнілася дапамога падшэфнаму калгасу імя Камінтэрна Дзяржынскага раёна. Камсамольцы ўніверсітэта дапамаглі абсталяваць калгасны клуб, сабралі і паслалі ў падарунак калгаснай моладзі бібліятэчку палітычнай і мастацкай літаратуры.

Р. Малюковіч спыніўся на недахопах у дзейнасці камсамольскай арганізацыі. Яшчэ не ўсе камсамольцы добрасумленна рыхтуюцца да заняткаў. Ёсць і такія, што парушаюць дысцыпліну, правілы сацыялістычнага супольнага жыцця, зневажальна ставяцца да сваіх абавязкаў. Адна з прычын гэтага, па думцы Р. Малюковіча, заключаецца ў тым, што камітэт камсамола не здолеў арганізаваць належную выхаваўчую работу камсамольскіх арганізацый курсаў і камсамольскіх груп, дрэнна падбірае і выхоўвае нізавых камсамольскіх актывістаў. За нядобрасумленнасць і абыякавасць да работы камітэт камсамола вымушан быў вызваліць ад абавязкаў сакратароў камсамольскіх арганізацый курсаў Пестрака (III курс хімфака), Франкфурта (II курс фізфака), групорга Чэрвонцава.

Р. Малюковіч просіць партыйны камітэт універсітэта аказаць камітэту камсамола дапамогу ў падборы і выхаванні нізавога камсамольскага актыву.

СТАРШЫНЯ мясцкома універсітэта **А. М. Міхайлаў** у сваім выступленні спыніўся на важнейшых галінах дзейнасці прафсаюзнай арганізацыі выкладчыкаў і адміністрацыйна-гаспадарчага персаналу ўніверсітэта. На паседжаннях мясцкома, сказаў ён, сістэматычна слухаліся справаздачы кафедр аб арганізацыі вучэбнай і навуковай работы, аб напісанні і абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

КАМУНІСТ тав. **Еўдакімаў** расказаў аб удзеле выкладчыкаў юрыдычнага факультэта ў прапагандзе прававых ведаў сярод насельніцтва рэспублікі. Па ініцыятыве партарганізацыі факультэта на грамадскіх пачатках створан універсітэт савецкага законадаўства. Сярод яго 300 слухачоў — члены таварыскіх судоў, камісій па працоўных спрэчках, лепшыя дружыннікі, партыйныя, прафсаюзныя і савецкія актывісты прадпрыемстваў і устаноў горада. Значную ўвагу ўніверсітэт удзяляе абагульненню вопыту барацьбы грамадскасці з праваапарушэннямі.

Грамадскія ўніверсітэты савецкага законадаўства створаны ў Магілёве, Гомелі і Віцебску, куды для аказання дапамогі і чытання лекцый выязджалі выкладчыкі юрыдычнага факультэта.

КАМУНІСТ тав. **Герасіменка**, крытыкаваў парадак правядзення ва ўніверсітэце студэнцкіх вечароў. Ён адзначыў, што партыйныя і грамадскія арганізацыі ўніверсітэта недастаткова ўвагі звяртаюць на мастацкую самадзейнасць, для развіцця якой яшчэ не створаны належныя ўмовы.

ПРАРЭКТАР універсітэта па навуковай рабоце **Г. А. Павецьеў** звярнуў увагу на неабходнасць значна палепшыць дзейнасць кафедр у галіне падрыхтоўкі маладых навуковых кадраў. У падборы, выхаванні, арганізацыі вучэбнай і навуковай работы аспірантаў, сказаў тав. Павецьеў, маюцца сур'ёзныя недахопы. З года ў год не выконваецца план набора аспірантаў, асабліва на матэматычным і філалагічным факультэце. На прыродазнаўчых факультэтах аспірантам не створаны ўмовы для эксперыментальнай працы. У выніку недахопаў у арганізацыі навуковай і вучэбнай работы большасць аспірантаў не абараняе ў тэрмін кандыдацкія дысертацыі. Маладыя выкладчыкі, скончыўшыя аспірантуру, звычайна перагружаны вучэбнай работай, што перашкаджае ім завяршаць напісанне дысертацый.

НАМЕСНІК старшыні універсітэцкай групы Таварыства па пашырэнню палітычных і навуковых ведаў **А. А. Галаўко** гаварыў аб удзеле членаў Таварыства ў палітыка-асветнай рабоце сярод насельніцтва. Група лектараў універсітэта прачытала на аўтамабільным заводзе, заводзе імя Варашылава, сярод рабочых будаўнічага трэста № 5 і г. д. больш 500 лекцый і дакладаў.

Тав. Галаўко азнаёміў прысутных з абавязацельствамі Таварыства, узятымі ў гонар XXII з'езда КПСС.

РЭКТАР універсітэта **А. Н. Сеўчанка** у сваім выступленні падрабязна расказаў аб рабоце Усесаюзнай нарады навуковых работнікаў, у якой ён удзельнічаў, аб задачах у развіцці навукі, што ўстаюць перад універсітэтам, аб перспектывах яго далейшага развіцця.

З прамовай аб задачах партыйнай арганізацыі ўніверсітэта выступіў на сходзе сакратар гаркома партыі тав. **Караткевіч.**

* * *

Адобрыўшы дзейнасць парткома, сход прыняў разгорнутую рэзалюцыю, у якой намечаны шляхі далейшага паляпшэння работы партыйнай арганізацыі універсітэта. Выбраны дэлегаты на чарговую партыйную канферэнцыю Ленінскага раёна.

**Нам. рэдактара Р. ПЛАТОНАЎ.**

**Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31. Тэлефон: 2-07-19.**

Друкарня выдавецтва МВСС і ПА БССР

АТ 06475 Заказ 1471.